**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# СТУПАКОЎ ЮРЫЙ ФЁДАРАВІЧ

**АКЦЁР, НАРОДНЫ АРТЫСТ БССР**

**24 САКАВІКА 1934 Г. – 24 КАСТРЫЧНІКА 1999 Г.**

**ФОНД № 384**

**ВОПІС № 1**

**[кан. 1950-х] – 1986 гг.**

**МІНСК 2020**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 384**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ю.Ф. СТУПАКОВА | 1-18 | 1-3 |
| 1.1. | ФАТАГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА Ў СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ СЕВАСТОПАЛЬСКАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЯ А.В. ЛУНАЧАРСКАГА | 1-3 | 1 |
| 1.2. | ТЭКСТЫ РОЛЯЎ, СЫГРАНЫХ Ю.Ф. СТУПАКОВЫМ У ДЗЯРЖАЎНЫМ РУСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ БССР ІМЯ М. ГОРКАГА | 4-5 | 1 |
| 1.3. | ФАТАГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА І ІНШ. | 6-18 | 1-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА | 19-38 | 3-6 |
| 2.1. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 19-24 | 3-4 |
| 2.2. | ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ, ПАДЗЯКА І ІНШ. | 25-38 | 4-6 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ Ю.Ф. СТУПАКОВА І ІНШ. | 39-42 | 6 |

## Прадмова

**Ступакоў Юрый Фёдаравіч** нарадзіўся 24 сакавіка 1934 г. у сям'і каваля ў вёсцы Рубцова Мыцішчанскага раёна Маскоўскай вобласці (РСФСР). У 1948 г. паступіў у рамеснае вучылішча, дзе браў удзел у пастаноўках гуртка мастацкай самадзейнасці. Адначасова наведваў гурток мастацкага слова пры Цэнтральным ДК чыгуначнікаў г. Масквы. У 1953 г. пры дапамозе І.М. Цярэшына – акцёра Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра СССР імя М. Горкага (цяпер МХАТ імя М. Горкага) – падрыхтаваўся да выступлення на Усесаюзным конкурсе чытальнікаў твораў У.У. Маякоўскага. У тым жа годзе быў мабілізаваны ў войска. У [др. пал. 1950-х гг.] працаваў у Ліпецкім абласным драматычным тэатры (цяпер Ліпецкі дзяржаўны тэатр драмы імя Л.М. Талстога) (спачатку рабочым сцэны, потым артыстам), з [пач. 1960-х гг.] да 1968 г. – у Севастопальскім рускім драматычным тэатры імя А.В. Луначарскага (цяпер Севастопальскі акадэмічны рускі драматычны тэатр імя А.В. Луначарскага). У 1968 г. быў запрошаны ў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага (цяпер – Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага. Здымаўся ў мастацкіх фільмах і серыялах.

Выконваў драматычныя і характарныя ролі. Найбольш вядомыя акцёрскія работы Ю.Ф. Ступакова ў Ліпецкім абласным драматычным тэатры [др. пал. 1950-х гг.]: Фёдар Абрамаў ("Барабанщица" А.Д. Салынскага) і Яга ("Отелло" У. Шэкспіра); у Севастопальскім рускім драматычным тэатры імя А.В. Луначарскага [п.п. 1960-х гг.]: Алека Дундзіч ("Олеко Дундич" М.А. Каца, А.Г. Ржашэўскага), Анёл Д ("Божественная комедия" [І.У. Штока]), Сямён Давыдаў ("Поднятая целина" М.А. Шолахава), Іван Сафонаў ("Русские люди" А.Ц. Аверчанкі) і інш.; у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага: Граф Шрусберы ("Мария Стюарт" Ф. Шылера) (1969), Старшына Васкоў ("А зори здесь тихие…" Б.Л. Васільева) (1971), Крыспен ("Единственный наследник" Ж.Ф. Рэн'яра) (1974), Макдуф ("Макбет" У. Шэкспіра) (1974), Бос Фінлі ("Сладкоголосая птица юности" Т. Уільямса) (1976), Немец ("Возвращение в Хатынь" паводле аповесці А.М. Адамовіча) (1977), Таварыш Пабеданоснікаў ("Баня" У.У. Маякоўскага) (1977), Маркіз дэ Шэрон ("Мольер" М.А. Булгакава) (1978), Штоцэк ("Принц Арно фон Волькенштэйн" Р. Штраля) (1981), Карніла ("Знак беды" паводле аповесці В.У. Быкава) (1985), Іван Ільіч ("Ночь ангела" А. Разанава) (1987) і інш.

Дэбют у кіно адбыўся ў ролі Гуркова ў міні-серыяле "Руины стреляют" ("Беларусьфильм", 1970–1972). Найбольш значныя кінаролі Ю.Ф. Ступакова: Камандзір ("Зимородок") ("Беларусьфильм", 1972), Генерал-маёр Віхраў (серыял "Государственная граница") ("Беларусьфильм", 1982–1986), А.М. Ціхаміраў (галоўная роля) ("Культпоход в театр") ("Беларусьфильм", 1982), Д.С. Рокатаў (міні-серыял "Предел возможного") ("Экран", 1984), Дырэктар завода (міні-серыял "Путь") ("Экран", 1986), Дзееў (галоўная роля) ("Закон")

(“Мосфильм”, 1989), Повар Сцяпан “Проклятый уютный дом” (“Беларусьфильм”, 1998) і інш.

З [1967 г.] член Украінскага тэатральнага таварыства. У 1973 г. атрымаў ганаровае званне “Заслужаны артыст БССР”, у 1980 г. – “Народны артыст БССР”. У 1975 г. быў узнагароджаны граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛітССР за ўдзел у Днях літаратуры і мастацтва БССР у Літве і Украіне.

Ю.Ф. Ступакоў памёр 24 кастрычніка 1999 г.

Дакументы Ю.Ф. Ступакова паступілі ў БДАМЛМ ад самога артыста ў 1978 і 1990 гг. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 42 справы (76 дак.) за [кан. 1950-х]–1986 гг.

Вопіс складаецца з 3 раздзелаў:

Першы раздзел – “Творчыя дакументы Ю.Ф. Ступакова” – складаецца з 3-х падраздзелаў, у якіх змешчаны фатаграфіі роляў, сыграных Ю.Ф. Ступаковым у Севастопальскім рускім драматычным тэатры імя А.В. Луначарскага і Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага, і тэксты роляў, сыграных Ю.Ф. Ступаковым у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага за 1963–1981 гг.

У другім раздзеле змешчаны віншавальныя тэлеграмы Ю.Ф. Ступакову з прысваеннем ганаровага звання “Заслужаны артыст БССР” (1973).

Трэці раздзел – “Дакументы да біяграфіі Ю.Ф. Ступакова” – складаецца з 2-х падраздзелаў. Тут змешчаны асабістыя дакументы Ю.Ф. Ступакова, дакументы да яго юбілею, пра яго і з яго ўпамінаннем і індывідуальныя фатаграфіі акцёра. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1963–1986 гг.

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
14.02.2020

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

ФОНД № 384
ВОПІС № 1
[кан. 1950-х]-1986

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 17.06.2020
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ю.Ф. СТУПАКОВА** | | | | |
| | **1.1. ФАТАГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА Ў СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ СЕВАСТОПАЛЬСКАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЯ А.В. ЛУНАЧАРСКАГА** | | | | |
| 1 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Голубая рапсодия", пастаўленага рэж. В.М. Стрыжовым паводле п'есы М.Ф. Пагодзіна, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Мішкі) і А.І. Падлеснага [ў ролі Івана Капліна] | 1963 | 1 | 1 | |
| 2 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Дурочка", пастаўленага рэж. В.М. Стрыжовым па п'есе Лопэ дэ Вега, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Лісео) і неўстаноўленага акцёра | 1965 | 1 | 1 | |
| 3 | Фатаграфіі сцэн з спектакля "Поднятая целина", пастаўленага рэж. В.М. Стрыжовым паводле рамана М.А. Шолахава, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Сямёна Давыдава) і неўстаноўленай актрысы [ў ролі Лушкі] | 1965 | 2 | 2 | |
| | **1.2. ТЭКСТЫ РОЛЯЎ, СЫГРАНЫХ Ю.Ф. СТУПАКОВЫМ У ДЗЯРЖАЎНЫМ РУСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ БССР ІМЯ М. ГОРКАГА** | | | | |
| 4 | Роля Старшыны Васкова з аповесці Б.Л. Васільева "А зори здесь тихие...". Два сшыткі пад адной вокладкай. Аўтограф Ю.Ф. Ступакова | 1971 | 32 | 1 | |
| 5 | Роля Боса Фінлі з п'есы Т. Уільямса "Сладкоголосая птица юности". Машынапіс з дапіскамі Ю.Ф. Ступакова | 1976 | 12 | 1 | |
| | **1.3. ФАТАГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА І ІНШ.** | | | | |
| 6 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Возраст расплаты", пастаўленага рэж. Ф.С. Шэйнам па п'есе Л.А. Жухавіцкага, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Мужа), Л.У. Былінскай (у ролі Іры), Ю.У. Сідарава (у ролі Антона Шапкіна), В.П. Шура (у ролі Валодзі) і | 1969 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | інш. | | | | |
| 7 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Враги", пастаўленага рэж. А.А. Даброціным па п'есе М. Горкага, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Міхаіла Скробатава) і [В.З. Краўчанкі (у ролі аканомкі Агаф'і)] | 1970 | 1 | 1 | |
| 8 | Фатаграфія сцэны з спектакля "А зори здесь тихие...", пастаўленага рэж. Б. Глаголіным і Ю.П. Любімавым паводле аповесці Б.Л. Васільева, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Старшыны Васкова), Л.У. Былінскай (у ролі Жэні Камяльковай), Б.А. Масумян (у ролі Рыты Асянінай), Н.Я. Чамадуравай (у ролі Лізы Брычкінай) і інш. | 1971 | 1 | 1 | |
| 9 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Билет в мягкий вагон", пастаўленага рэж. А.Д. Смеляковым па п'есе А.І. Маўзона, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Пыжа) і [Н.Я. Чамадуравай (у ролі Іны)] | 1971 | 1 | 1 | |
| 10 | Фатаграфіі сцэны з спектакля "Единственный наследник", пастаўленага рэж. У.А. Маланкіным па п'есе Ж.Ф. Рэн'яра, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Крыспена), В.М. Клебановіч (у ролі Лізэты) і інш. | 1974 | 1 | 1 | |
| 11 | Фатаграфія сцэны з спектакля ["Протокол одного заседания"], пастаўленага па п'есе А.І. Гельмана, з удзелам Ю.Ф. Ступакова, Ю.У. Сідарава, К.А. Шышкіна і інш. у неўстаноўленых ролях | [1974] | 1 | 1 | |
| 12 | Фатаграфіі Ю.Ф. Ступакова (у ролі Простага чалавека) ("Энергичные люди" В.М. Шукшына, рэж. А. Кузняцоў) і сцэн з гэтага спектакля з удзелам Ю.Ф. Ступакова, Э.М. Аўчыннікавай (у ролі Сонькі), А.А. Бялова (у ролі Пузатага), А.Ф. Кашкера (у ролі Чарнявага), В.З. Краўчанкі (у ролі Веры Сяргееўны Кузькінай), Ю.У. Сідарава (у ролі Арыстарха Пятровіча Кузькіна) і інш. | 1974 | 5 | 5 | |
| 13 | Фатаграфіі сцэны з спектакля "Последние", пастаўленага рэж. Б.І. Луцэнкам і У.А. Маланкіным па п'есе М. Горкага, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Івана Каламійцава) і С.П. Кузьміной (у ролі Соф'і, яго жонкі). Фатограф У.А. Крук | 1976 | 1 | 1 | |
| 14 | Фатаграфія Ю.Ф. Ступакова (у ролі Ягора Максімавіча Малахава) у спектаклі "Последняя инстанция" па п'есе М.Я. Матукоўскага | 1976 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 15 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Баня", пастаўленага рэж. Б.І. Луцэнкам па п'есе У.У. Маякоўскага, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Таварыша Пабеданосікава) і В.М. Клебановіч (у ролі Полі, яго жонкі) | 1977 | 1 | 1 | |
| 16 | Фатаграфіі сцэн з спектакля "Синие кони на красной траве", пастаўленага рэж. Д. Дзіджыёкасам па п'есе М.П. Шатрова, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі У.І. Леніна), З.Г. Асмолавай (у ролі Н.К. Крупскай), В.М. Клебановіч (у ролі Сапожнікавай), Ю.У. Сідарава (у ролі Доктара Обуха) і інш. Фатограф У.А. Крук | 1979 | 4 | 4 | |
| 17 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Принц Арно фон Волькенштэйн", пастаўленага рэж. К. Гасауэрам па п'есе Р. Штраля, з удзелам Ю.Ф. Ступакова (у ролі Штоцэка), [М. Мамедава (у ролі Прынца)] і інш. | 1981 | 1 | 1 | |
| | *  *  * | | | | |
| 18 | Фатаграфіі з кінаспроб Ю.Ф. Ступакова на ролю Бацькі Панаса і інш. ролі ў неўстаноўленых кінафільмах | 1972/1973-[1970-я гг.] | 3 | 3 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ю.Ф. СТУПАКОВА** | | | | |
| | **2.1. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 19 | Членскі білет таварыства "Знання" (УССР) на імя Ю.Ф. Ступакова | 1966 | 3 | 1 | |
| 20 | Членскі білет Украінскага тэатральнага таварыства на імя Ю.Ф. Ступакова | 1967 | 2 | 1 | |
| 21 | Пасведчанне "Заслужанага артыста БССР" на імя Ю.Ф. Ступакова | 1973 | 2 | 1 | |
| 22 | Кніжка да нагруднага значка "Отличник культурного шефства над Вооружёнными Силами СССР" на імя Ю.Ф. Ступакова. Пасведчанне да значка "Отличник культурного шефства над селом" Міністэрства культуры СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры на імя Ю.Ф. Ступакова | 1973, 1978 | 4 | 2 | |
| | *  *  * | | | | |
| 23 | Афіша творчай справаздачы артыста Севастопальскага рускага драматычнага тэатра імя | 1963 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | А.В. Луначарскага Ю.Ф. Ступакова на аглядзе творчай моладзі Крымскіх тэатраў | | | | |
| 24 | Афіша лекцыі-канцэрта "В. Маяковский. С. Есенин" абласнога конкурсу чытальнікаў-акцёраў крымскіх прафесійных тэатраў (Ю.Ф. Ступакоў - удзельнік) | 1967 | 1 | 1 | |
| | **2.2. ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ, ПАДЗЯКА І ІНШ.** | | | | |
| 25 | З. Федчанка. "Актёр и время. К 50-летию со дня рождения народного артиста БССР Ю.Ф. Ступакова". Артыкул. Выразка з газеты | 1984 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Граматы Крымскага абкама прафсаюза работнікаў культуры, Упраўлення культуры Крымскага аблвыканкама і інш. за выкананне ролі Анёла Д у спектаклі "Божественная комедия" і ролі Хрусталёва ў спектаклі "Шестое июля" на імя Ю.Ф. Ступакова | 1965, 1967 | 2 | 2 | |
| 27 | Граматы Крымскага абласнога камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні і Крымскай студыі тэлебачання за актыўны ўдзел у іх рабоце на імя Ю.Ф. Ступакова | 1965, 1967 | 2 | 2 | |
| 28 | Ганаровыя граматы Міністэрства культуры УССР, Украінскага рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў работнікаў культуры і інш. за "высокае прафесійнае майстэрства, поспехі ў творчым развіцці моладзі тэатраў і канцэртных арганізацый Украіны" і інш. на імя Ю.Ф. Ступакова | 1965-1967 | 3 | 3 | |
| 29 | Ганаровыя граматы і падзяка мастацкага савета Маладзечанскага міжраённага Дома народнай творчасці, Мінскага абласнога савета прафсаюзаў і інш. за "выступы на дзіцячых навагодніх прадстаўленнях", "дапамогу народным талентам Міншчыны" і інш. на імя Ю.Ф. Ступакова | 1971-1974 | 5 | 4 | |
| 30 | Грамата і дыплом Беларускага тэатральнага таварыства за выкананне роляў Старшыны Васкова ў спектаклі "А зори здесь тихие...", У.І. Леніна ў спектаклі "Синие кони на красной траве", Марозкі ў спектаклі "Разгром" на імя Ю.Ф. Ступакова за подпісамі Л.П. Александроўскай і М.М. Яроменкі | 1972, 1980 | 2 | 2 | |
| 31 | Дыплом II ступені Рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў на лепшае выкананне літаратурных | | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | твораў, прысвечаных ваенна-патрыятычнай тэме (г. Мінск, 28-29 мая 1975 г.), на імя Ю.Ф. Ступакова | | | | |
| 32 | Грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР "за вялікую работу па падрыхтоўцы і правядзенні Дзён літаратуры і мастацтва Беларускай ССР ва Украінскай і Літоўскай ССР" на імя Ю.Ф. Ступакова | 1975 | 1 | 1 | |
| 33 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР за "работу па прапагандзе дасягненняў беларускай культуры сярод працоўных Літвы" і ў сувязі з Днямі літаратуры і мастацтва БССР у ЛітССР на імя Ю.Ф. Ступакова | 1975 | 2 | 1 | |
| 34 | Ганаровыя граматы Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры, ЦК ЛКСМБ і інш. за актыўную работу па "камуністычнаму выхаванню моладзі", "культурнаму шэфству над Узброенымі Сіламі СССР" і "органамі і падраздзяленнямі Міністэрства ўнутраных спраў СССР" і інш. на імя Ю.Ф. Ступакова | 1977-1980 | 6 | 5 | |
| 35 | Ганаровая грамата Міністэрства культуры Эстонскай ССР за "актыўны ўдзел у гастрольных спектаклях у г. Таліне" на імя Ю.Ф. Ступакова | 1980 | 3 | 1 | |
| 36 | Ганаровыя граматы аўтабазы № 2 Мінгаркіравання грузавога аўтатранспарта Мінаўтатранспарта БССР і будаўнічага трэста № 37 г. Лангепаса Ніжневартаўскага раёна Цюменскай вобласці за "падняцце творчага духа і павышэнне працоўнай актыўнасці будаўнікоў-дарожнікаў трэста "Белнефтестрой" у час іх знаходжання ў Заходняй Сібіры" на імя Ю.Ф. Ступакова | 1982 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 37 | Віншавальныя тэлеграмы з прысваеннем ганаровага звання "Заслужаны артыст БССР" ад сям'і Уладамірскіх, Ф.І. Шмакава і інш. Ю.Ф. Ступакову | 1973 | 3 | 3 | |
| 38 | Віншавальная тэлеграма з прысваеннем ганаровага звання "Заслужаны артыст БССР" ад бацькоў і знаёмых Ю.Ф. Ступакову | 1973 | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ Ю.Ф. СТУПАКОВА І ІНШ.** | | | | |
| 39 | [В.] Ражкоўскі. "О человеке бесстрашном", Н. Ступіна. "Аттестат зрелости" і інш. Артыкул, нататкі і інш. пра спектаклі Ліпецкага абласнога | [кан. 1950-х гг.] -1986 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | драматычнага тэатра, Севастопальскага рускага драматычнага тэатра імя А.В. Луначарскага і Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага (з упамінаннем Ю.Ф. Ступакова). Выразкі з газет і часопіса | | | | |
| 40 | К.П. Стрыжова. "Творческие портреты. Заслуженный артист БССР Ю.Ф. Ступаков". Сцэнарны план. Машынапіс з праўкай і карэктурай Ю.Ф. Ступакова | 1977 | 13 | 1 | |
| 41 | Пісьмо намесніка міністра культуры БССР С.[А.] Пятровіча дырэктару Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага М.А. Няронскаму з просьбай забяспечыць удзел Ю.Ф. Ступакова ў канцэрце майстроў мастацтваў для ўдзельнікаў мітынга польска-савецкага сяброўства | 1976 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 42 | Фатаграфіі Ю.Ф. Ступакова, індывідуальныя: у час выступлення на Калінінградскім тэлебачанні, чытання "Думы про Опанаса" Э.Г. Багрыцкага і інш. Адна наклеена на кардон, з адваротнага боку кардона прыклеена фотакопія малюнка Ф.Д. Куцінава з выявай марскога горада. Л. 3 | [1965]-1976 | 5 | 4 | |

У дадзены вопіс унесена 42 (сорак два)

спраў з № 1 па № 42 , 76 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

____________________

____________________

"_____"____________20____ г.